# Робэрт Данелюк

Аўтар праекту "LOMOўсход"



У цяперашні час зьяўляецца студэнтам III курса Акадэміі мастацтваў у Гданьску. Выпускнік Варшаўскага Фотатэхнікума. Здымае з 1998г. Нарадзіўся ў Варшаве.

Аўтар праекта "Пад зямлёю", які адлюстроўвае жыцьцё варшаўскага мэтро (здымаў на мабільны тэлефон). Адзін з арганізатараў адзінага ў Польшчы Фэстывалю фотаблёгаў. Мае ўласны фотаблёг (http://senq.ownlog.com), які паводле крытыкаў з'яўляецца бадай ці ня самым запамінальным у польскім сеціве. Ужо доўгі час здымае ў асноўным рэчаіснасьць стану, але не замыкаецца на адзіным тыпе здымкаў, бо лічыць гэта вельмі нудным заняткам.

Пасьвячаючы сябе фотамастацтву, хоча давесьці, каб кожны адбітак выклікаў пэўную рэакцыю, узрушаў мазгавыя працэсы. Любіць фіксаваць індустрыяльныя краявіды, пустыя і забытыя месцы, элементы мінулай эпохі. Перыядычна ў прэсе, а таксама на сваім сайце публікуе рэпартажы з-за ўсходняй мяжы. Робіць гэта наўмысна, каб прадстаўнікі польскага грамадства скончылі жыць стэрэатыпамі пэўных палітычных колаў. Лічыць, што кожнаму паляку варта было б паехаць ва ўсходнія краіны-суседкі, каб упэўніцца, што ня ўсё так кепска, як пішуць у газэтах і часопісах.
Пасьля Беларусі ягонай найблізшай мэтай з'яляецца цыкль фотаздымкаў аб жыцьці людзей яшчэ больш на ўсход - ад Смаленска да Уладзівастока.

Праект "LOMOўсход" нясе ў сабе ўсё тое, што майстар зафіксаваў падчас шматкротных падарожжаў па гэтай часцы Эўропы. Нешаблоннае фота поўніцца сваёй магіяй.

www.danieluk.net
robert@danieluk.net
+48 600 247 191